**КАСПЯРОВІЧ** Мікалай Іванавіч [22. 05. 1900, в. Ізабалёва Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. – 26. 12. 1937], вучоны-краязнавец, лексікограф, мастацтвазнавец, педагог.

Скончыў вышэйшае Ігуменскае пачатковае вучылішча (1917), здаў экстэрнам экзамен у Бабруйскай гімназіі. Працаваў настаўнікам на Міншчыне і адначасова вучыўся на літаратурна-мастацкім аддзяленні Мінскага інстытута народнай асветы, які скончыў у 1921 г. З 1921 г. працаваў інструктарам аддзела Народнага камісарыята асветы БССР, з лістапада 1922 г. школьным інспектарам Слуцкага, са жніўня 1924 г. Віцебскага акруговых аддзелаў народнай асветы. У верасні 1926 г. быў прызначаны навуковым сакратаром Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце і сакратаром краязнаўчага часопіса “Наш край”. Беспадстаўна абвінавачаны ў нацыяналізме, 10. 04. 1931 г. асуджаны на 5 гадоў, 28. 08. 1937 г. арыштаваны паўторна, расстраляны.

Навуковыя інтарэсы М. І. Каспяровіча былі накіраваны на распрацоўку тэорыі і практыкі краязнаўства ў школе. Аўтар “Беларуска-расійскага слоўнічка” (1925), “Віцебскага краёвага слоўніка” (1924), артыкулаў “Арганізацыя краязнаўчага руху”, “Вывучэнне культурнага стану краю” і інш. Актыўна супрацоўнічаў у часопісах “Наш край”, “Асвета”, “Працаўнік асветы”. За восем гадоў творчай дзейнасці надрукаваў звыш двухсот публікацый (манаграфіі, артыкулы, рэцэнзіі, навуковыя інфармацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ